ПОГЛЯД ЗБОКУ

# ГРОШЫ Ў СМЕТНІЦУ, або Пра што маўчаць яноты

**У нашай краіне ўжо не першы год прапагандуюць раздзельны збор смецця. Напэўна, няма чалавека, які б не бачыў рэкламу, дзе яноты заклікаюць да свядомасці грамадзян, каб тыя правільна размяркоўвалі адходы па кантэйнерах. І людзі сапраўды падтрымалі гэтую ініцыятыву. Усё б добра, але ідэальную карціну псуе адно цікавае пытанне: «Вы бачылі калі-небудзь, як збіраюць адходы ў кантэйнеры для раздзельнага збору?» Адказ парадаксальны — усе адсартаваныя другасныя рэсурсы часта скідаюць у адну машыну, каб потым прывезці іх на сартавальныя лініі смеццевага завода. А навошта тады было збіраць раздзельна? Пра тое, хто зарабляе на смецці, хто за гэта плаціць і як можна было зарабіць інакш — чытайце далей.**




### Бясплатная ініцыятыва?

Сістэмай раздзельнага збору смецця, якая прыйшла да нас з Захаду, у краіне заняліся сур'ёзна. Толькі сёлета павінны заварыць амаль 2000 смеццеправодаў у Мінску. Узамен жыхары сталіцы атрымаюць 130 кантэйнерных пляцовак. Аднак існуе меркаванне, што кансервацыя смеццеправодаў не зробіць нічога добрага, акрамя таго, што палепшыць санітарны стан пад'ездаў. Людзі ж вымушаны будуць пастаянна спускацца з кватэр і сартаваць адходы па кантэйнерах, колькасць якіх павялічыцца каля пад'ездаў у разы.

Варта адзначыць, што ў Еўропе людзей стымулююць да раздзельнага збору другасных рэсурсаў праз дыферэнцаваную сістэму аплаты за набытыя кантэйнеры для раздзельнага збору адходаў. У выпадку, калі працэс сартавання жыхарамі дома парушаецца, то і памер аплаты за кантэйнер павялічваецца. Нас таксама прымушаюць плаціць за збор, сарціроўку і вываз бытавых адходаў і адначасова спрабуюць прыканаць заносіць у кантэйнер другасную сыравіну бясплатна.

Але ж для насельніцтва нашай краіны ёсць альтэрнатыва. У Беларусі шмат гадоў (а дакладней, ужо больш за стагоддзе) дзейнічае сістэма нарыхтоўчых пунктаў другасных рэсурсаў Белкаапсаюза, а таксама Белрэсурсаў, ЖКГ, дзе грамадзянам выплачваюць грошы за прынесеную другасную сыравіну. Аднак сёння кантэйнеры жывуць сваім жыццём, а нарыхтоўчыя пункты — сваім. Прычым, у краіне ствараецца і такая сітуацыя, калі дзве сістэмы збору другаснай сыравіны нават перашкаджаюць адна адной.

Лагічна, што можна было б замест кантэйнераў для раздзельнага збору стварыць нарыхтоўчыя пункты, і жыхары кожнага мікрараёна змаглі б зарабіць грошы на сваіх адходах. Людзі б проста адносілі адсартаваныя макулатуру, шкло, ПЭТ-бутэлькі не ў кантэйнеры, а на нарыхтоўчы пункт. Шмат у чым гэта б вырашыла і тую праблему, калі чалавек выходзіць з кватэры ў шматпавярховым доме і літаральна ўпіраецца ў некалькі кантэйнераў, якія ставяцца каля самага ўвахода ў пад'езд, што сустракаецца даволі часта ўжо не толькі ў Мінску, нават і ў райцэнтрах.

Арганізацыі ЖКГ год ад году пашыраюць колькасць кантэйнераў для раздзельнага збору ў гарадах і малых населеных пунктах. У той жа час таму ж Белкаапсаюзу даволі часта мясцовыя ўлады адмаўляюць у выдзяленні зямлі для стварэння нарыхтоўчых пунктаў другаснай сыравіны, а дзяржаўная ўстанова «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» адмаўляе ў фінансаванні закупкі нарыхтоўчых пунктаў — якраз з прычыны наяўнасці кантэйнераў для раздзельнага збору адходаў вакол месца, дзе мог бы размясціцца пункт.

Тут варта растлумачыць, што «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» фарміруе фонд і акумулюе грошы на развіццё ў краіне прыёманарыхтоўчай сеткі, кантэйнераў раздзельнага збору, смеццеперапрацоўчых заводаў і г. д.

### Такія вось парадоксы

Абслугоўванне кантэйнерных пляцовак у двары адбываецца часта за кошт сродкаў грамадзян. Атрымліваецца, што мы плацім грошы за абслугоўванне кантэйнерных пляцовак, за вываз смецця і за ўтылізацыю адходаў. Мы бясплатна павінны сабраць адходы, адсартаваць іх і аднесці ў кантэйнер (таму што смеццеправод будзе, хутчэй за ўсё, завараны). І пры гэтым чым больш мы выкінем адходаў у павялічаную колькасць кантэйнераў, тым больш заплацім за яго вываз і, заканамерна, большай будзе сума ў жыроўцы.

Ёсць і яшчэ адзін парадокс. Вельмі часта смеццявоз, які прыязджае, каб сабраць паасобна раскладзеныя адходы, згружае іх усе цалкам у адну кучу. Далей ён перавозіць іх на смеццеперапрацоўчы завод, дзе... зноў пачынаецца працэс сартавання. А гэта зноў жа павялічвае кошт нашай жыроўкі.

Чым адрозніваецца прыёманарыхтоўчы пункт? Там таксама збіраюць адходы раздзельна. Пры гэтым у пункце выплачваюць здатчыкам грошы за другасную сыравіну Далей усё гэта, амаль адразу, асобна вывозіцца на перапрацоўчыя прадпрыемствы краіны, мінуючы сартавальныя лініі. Пры гэтым ажыццяўляецца збор з захоўваннем якасных параметраў другаснай сыравіны, што дазваляе яе больш эфектыўна перапрацаваць з найменшымі стратамі і зноў пусціць у гаспадарчы абарот.

«Мы павінны даць насельніцтву права выбару — выкінуць адходы у кантэйнер, ці аднесці іх у нарыхтоўчы пункт і атрымаць за гэта грошы. Сёння трэба пашыраць і наблізіць прыёманарыхтоўчую сетку да насельніцтва. Варта таксама адзначыць, што ў апошнія гады пашыраецца спектр нарыхтоўваемай другаснай сыравіны (адпрацаваная аўтамабільная аліва, бытавая тэхніка, тэкстыльныя адходы). Атрыманыя ў нарыхтоўчым пункце грошы насельніцтва па жаданні можа накіраваць на аплату часткі жыроўкі», — расказала **начальнік упраўлення нарыхтовак Белкаапсаюза Аксана СКІНДЭР.**

Вось і атрымліваецца, што камунальныя службы не дагаворваюць з дапамогай янотаў пра тое, што на смецці можна было б сэканоміць аплату паслуг ЖКГ. Дарэчы, рыхтуецца яшчэ адна рэклама, дзе яноты будуць вадзіць грамадзян па смеццесартавальным заводзе. Можа, янотам варта было б усё ж правесці экскурсію і па нарыхтоўчым пункце?

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

СТАЛІЧНЫЯ АДМЕТНАСЦІ

# НА СВАЁЙ ХВАЛІ

## Які век адмераны мінскім водакалонкам?

**У дзяцінстве калонка, размешчаная непадалёк ад бабулінага прыватнага дома, здавалася сапраўдным цудам. Гэта ж цэлая прыгода: можна набраць вядро вады за лічаныя імгненні, памыць побач машыну, у спякотнае надвор'е ўмыцца самому і нават папіць проста з краніка ледзяной вады... А што можа быць весялей, чым апырскаць адно аднаго і прыйсці дадому абсалютна мокрымі, але шчаслівымі? У дарослым жыцці водаразборная калонка ўжо не бачыцца сімвалам весялосці і бесклапотнасці. Клопатаў якраз хоць адбаўляй: адсутнасць водаправода ў доме наўрад ці будзе асацыявацца з прыгодамі, а ўнушальныя рахункі за карыстанне калонкай — дзякуючы тым самым юным весялунам — могуць прымусіць не тое што ўсміхнуцца, а выпусціць скупую слязу. Мы паспрабавалі высветліць, як змагацца з агульным доступам да калонак і ці доўга яшчэ можна будзе бачыць іх на вуліцах Мінска?**

Дарэчы, на дзяцей, якія дарма льюць чыстую ваду, хутчэй за ўсё, нагаворваць не варта. Значная частка з іх нават не падазрае, для чаго патрэбныя гэтыя мудрагелістыя ўстаноўкі. Усё ж калонку інакш як прывітаннем з мінулага стагоддзя не назавеш, бо сталічныя дамы, у якіх няма водаправода, вялікая рэдкасць. Ды і тыя наўрад ці належаць руплівым гаспадарам — часцей за ўсё не ў самых камфортных умовах жывуць праблемныя сем'і і адзінокія пажылыя людзі, у якіх не застаецца ні сіл, ні сродкаў, каб змяніць сітуацыю. Яшчэ адзін варыянт — тыя мінчане, над якімі ледзь не дзясяткамі гадоў вісела пагроза зносу раёна, вось і не праводзілі ў дом камунікацыі. Зараз горад пачаў больш выразна адказваць на пытанні пра планы па зносе. Ды ўвогуле Мінск паступова адыходзіць ад старой прыватнай забудовы, асабліва бліжэй да цэнтра. Але яшчэ многія вулачкі навяваюць думкі не пра велічную сталіцу, а пра зусім іншыя мясціны. Якраз туды, пакуль ёсць такая магчымасць, мы і адправіліся.

Нягледзячы на тое, што адлік часу да заканчэння існавання многіх дамоў у Сельгаспасёлку ідзе на месяцы, атмасфера тут спакойная: то тут, то там, дзе не вельмі высокія агароджы, відаць, як людзі наводзяць у сябе ў дварах парадак пасля зімы. Праўда, пагутарыць згаджаюцца далёка не ўсе. А хто і гатовы, нічога добрага на гэту тэму сказаць не можа. «З маіх суседзяў толькі Іванавіч ваду ў калонцы набірае. Дык, у яго ні кацяняці, ні дзіцяці, а толькі напаўразбураны дом бацькоўскі. Усе грошы спускае на адно, — робіць характэрны жэст Таццяна Пятроўна, якую мы сустракаем па дарозе з крамы. — Ды ён асабліва не пакутуе: ні памыцца, ні прыбрацца, ні бялізну перамыць — нічога не трэба. А я нават думаць не хачу, як бы я без водаправода спраўлялася. У юнацтве па два велізарныя вядры з калодзежа прыносіла, цяпер мне гэта не пад сілу».

Дзеля цікавасці вырашаем падысці да нашай галоўнай «гераіні» — калонкі. Праўда, скарыстацца ёй дакладна не атрымаецца: няма неабходнай ручкі. Дарэчы, як адзначаюць на прадпрыемстве «Вадазбыт» (УП «Мінскводаканал»), менавіта водаразборныя ручкі — самы дзейсны спосаб пачаць выкарыстоўваць калонкі рацыянальна. Спецыяльныя ручкі выдаюць толькі жыхарам навакольных дамоў, якім пітная вада неабходная для побыту. Але, як аказалася, народныя «ўмельцы» без асаблівых цяжкасцяў могуць вырабіць патрэбны рычаг. І ўсё ж такі для гэтага трэба пастарацца, а таму любы сустрэчны не стане праліваць ваду дарэмна. Наогул, галоўная праблема не ў тым, што адкрыць калонку можа кожны, а ў тым, як ён гэтую ваду будзе выкарыстоўваць. Папіць — калі ласка, а вось мыць машыну ці паліваць агарод пітной вадой — усё ж недазвальняльная раскоша.



На пачатак гэтага года ў Мінску налічвалася 620 калонак. Пры гэтым за апошнія пяць гадоў іх колькасць зменшылася амаль у два разы. Прынцып, па якім калонку дэмантуюць або адключаюць, просты: у радыусе 100 метраў ад яе не павінна застацца дамоў без водаправода. Але нават калі гэта ўмова выканана, дэмантаваць калонку адразу ж ніхто не будзе. Для пачатку яе адключаць на тры месяцы, каб праверыць, ці не будзе скаргаў ад мясцовых жыхароў. Так што аб тым, што калонкі знікнуць бясследна ў найбліжэйшы час, гаворка пакуль не ідзе. Усё ж падключэнне водаправода — справа добраахвотная. І многія людзі, у якіх яго няма, не занадта з-за гэтага пакутуюць: маўляў, што тут складанага? Прынесці вядро вады — мінімальная зарадка. Зараз у сталіцы адкрыта каля 1800 асабовых рахункаў на карыстанне водакалонкамі.

Дарэчы, спецыяльныя здымныя ручкі — не адзіны спосаб блакавання калонкі. Некаторыя па-старому навешваюць на яе замок, іншыя — карыстаюцца адпаведнай электроннай картай. (Праўда, у Беларусі гэтую тэхналогію не выкарыстоўваюць, калі цікава паглядзець, як яна працуе, трэба ехаць у Расію, напрыклад у Іркуцк або Волагду.)

Па вуліцах Сельгаспасёлка мы гулялі каля дзвюх гадзін. І ці то нам не пашанцавала, ці то так сітуацыя склалася — нам не трапіўся ні адзін чалавек, які набіраў бы ваду з калонкі. Так і стаяць яны самотна, моўчкі нагадваючы аб эпохах, якія незваротна сыходзяць...

**Дар'я КАСКО.**